5 Ис 6960

Ба 58795

Ул. Тэраўскі

# БЕЛАРУСКІ ЛІРНІК

## СЬПЕЎНІК НА ЧАТЫРЫ ГАЛАСЫ

Выданьне Навукова-Літэрацкага Аддзелу
Народнага Камісарыяту Асьветы Б. С. С. Р.
Бэрлін 1922

БССР

5Це 6960

Беларуская Савецкая Сацыялістская Рэспубліка

Ул. Тэраўскі

# БЕЛАРУСКІ ЛІРНІК

## СЬПЕЎНІК НА ЧАТЫРЫ ГАЛАСЫ

Выданьне Навукова-Літерацкага Аддзелу
Народнага Камісарыяту Асьветы Б. С. С. Р.
Бэрлін 1922

Нацыянальная бібліятэка Беларусі

ДРУКАВАНА ВЫДАВЕЦКІМ АДДЗЕЛАМ ГАНДЛЁВАГА ПРЭДСТАЎНІЦТВА
Н. К. У. Г. У НЯМЕЧЧЫНЕ.

# АД АЎТАРА.

Выпускаючы ў сьвет свой першы зборнік беларускіх сьпеваў на чатыры галасы, я меў на ўвазе ў першую чаргу й як найхутчэй здаволіць шырокія патрэбы грамадзянства, якое ў апошні час так шчыра й нясупынна ўзялося за разьвіцьцё й пашырэньне свае роднае беларускае культуры.

Да гэтага часу ў друку зьявілася вельмі мала беларускіх народных музыкальных твораў, дзеля чаго хоры, каб папаўняць свой рэпэртуар, пачынаюць карыстацца чужымі мэлёдыямі, не адпавядаючымі духоўнаму складу беларуса.

Усё гэта і прымусіла мяне апрацаваць чыста беларускія народныя творы, лік якіх даходзіць да 500 нумараў, каб кожны, паслухаўшы іх у выпаўненьні хорам, мог здразумець, што беларускія сьпевы па сваей пекнаце й багацьцю ня горш за іншыя, што ў іх, як у люстры адбіваецца ўвесь духоўны настрой гаротнага селяніна.

Хоць народныя сьпевы па складу свайму й бываюць вельмі цяжкія, але, услухаўшыся ў іх, шмат хто ўбачыць хараство родных мэлёдый, унясе іх з сабой у жыцьцё й, можа быць, ня раз, дзякуючы ім, знойдзе духоўны супакой.

Гэта й мае вялікую вартасьць для захаваньня й разьвіцьця культуры. Будзем спадзявацца, што грамадзянства зразумее гэта і з свайго боку прыме ўсе належныя крокі, каб, запісваючы мэлёдыі, дапамагчы ў агульнай працы.

Пры гарманізацыі песьняў я стараўся цалкам захаваць народную мэлёдыю, перадаючы яе аднаму з галасоў хору, галоўным чынам вышэйшаму.

Каб-жа „ЛІРНІК" не паказаўся вельмі аднабокім, я прымушан быў унесьці ў яго некалькі сьпеваў, гарманізаваных іншымі аўтарамі.

Па сваёй гарманізацыі зьмяшчоныя тут сьпевы падыходзяць к кожнаму хору як з вялікімі, гэтак сама й з малымі сіламі. Нават школьныя хоры могуць знайсьці тут сабе вялікі матэр'ял.

Усе зьмяшчоныя тут нумары выпаўняюцца Беларускім Дзяржаўным Хорам на розных канцэртных выступленьнях.

Апрача гэтага першага „ЛІРНІКУ" ў хуткім часе будуць выпушчаны новыя зборнікі, апрацованых мною сьпеваў.

Нарэшце прыношу шчырую падзяку ўсім, хто сваей радай і крытыкай дапамагаў мне ў працы.

Асабліва дзякую сваім супрацоўнікам па хору с. с. Пуроускаму К. Фальскаму Ус. і Ламаку К. за іх самы гарачы удзел і за запісаныя імі народныя сьпевы.

Ул. Тэраўскі.

## 1. Міжнародны гымн.

(„Інтэрнацыянал“)

Напісаў Эжэн Пот'е.

*Гарм. Тэррайскага.*












2.

Ніхто ня дасьць самохаць волі —
Ні бог, ці цар, ні багатыр,
Даб'ёмся самі лепшай долі . . .
Дабро для ўсіх — наш правадыр.
Каб ня згібаці плеч пакорных,
Каб волі дух лунаў у нас, —
Адважна плаўма сталь у горнах,
Пакуль у кузьні жар ня згас!

3.

Уласьць гняце, закон хітруе,
Кроў з бедных ссуць, падаткі, чынш.
Нішто багатых ня турбуе,
Правы гаротных — сьмех адзін!
Даволі жыць чужою ласкай,
Закон аб роўнасьці давёў: —
„Няма правоў без абавязкаў
І абавязкаў без правоў!"

4.

Нікчэмны ў торжышчы ўсеўладным,
Капальняў, фабрыкаў паны,
Чужую працу толькі складны
Пазьверску рабаваць яны.
У скрынкі-складні сытай банды
Дабро працоўнае пашло,
Хай-жа бядак даб'ецца праўды,
Каб што здабыў — яго было!

5.

Цары паілі нас маною,
Дык нам спакой, а ім — вайна!
Супроць вайны пайдзём вайною:
Душа ў салдаты — ні адна.
Калі-ж уладзяць з намі гулі —
Пагоняць нас на бой за іх, —
То будуць знаць, што нашы кулі
Пачнуць страляць па іх саміх.

6.

Мы ўсе работнікі, сяляне —
Сусьветны рой працаўнікоў —
Мець будзем на зямлі ўладаньне —
А дармаеды — прэч! далоў!
Жывіцца целам нашым годзе.
Усім трутнём і груганом!
Для нас паўстаўшых сонца ўсходзе,
Сьвяціць нам будзе век вяком!

Гэта бой наш астатні
За працоўны народ,
Каб у лучнасьці братцяй,
Узьняўся людзкі род!

Поўны калектыўны пераклад, зроблены з арыгіналу ў францускай мове й зацьверджаны беларусамі-камуністамі.

АД РЭДАКЦЫІ. Прынята камуністамі ў Расеі пяяць толькі 1, 2, і 6 васьмірадковыя звароткі з прыпеўкай посьля кожнае зваротки „Гэта бой наш астатні"... і г. д.

## 2. А хто там ідзе.

*Словы Я. Купалы.*
*Гарм. Тэрраўскага.*




гром-ніс-тай та-кой гра-ма-дзе? Бе-ла-ру-сы! А
што я-ны ня-суць на ху-дых плячах, ца у лап-цях на-гах, на у
кры-ві ру-ках? Сва-ю крыў-ду... А ча-го-ж, ча-го
за-ха-целась ім пагар-джаным век ім сьляпым, глухім?
Людзьмі




## 3. Панам мы песьні не сьпяваем.

*Словы Ф. Аляхновіча.*
*Муз. В. Тэраўскага.*

*Павольна.*







ма - - ем для тых, што жы - лі век ўбяд - но - це.
Хто ба - чыў ў жыць - ці го - ра мно - га, сьпевы
на - шы бу - дуць да спа - до - бы, да тро - ну ён да - ля - ціць
Бо - га, зва - ру - шыць з мейс - ца на - ват гро - бы.

Бо ў нашай песьні многа болю,
Жальбы ёсьць шмат, сьлёз цэла мора,
Праз нашу доўгую няволю,
Праз нашу доўгу биду-гора.
Дык годзе, годзе сьлёзы ліці!
Хапайце косы, стрэльбы ў рукі,
Пачнём інакш мы хутка жыці —
Пара закончыць нашы мукі.

Той, кім дагэтуль пагарджалі,
Адзін пры адным хай тут стане!
Мы годзе, годзе часу спалі —
Цяпер нам жыць пара настане!
Цяпер ўсім горда ў вочы ґлянем,
Галосна гукнем: зямлі, волі!
Усе, як адзін, сьмела паўстанем,
Каб ратаваць сябе з няволі.

## 4. Чачотачка.

*Жвава.* *Гарм. Тэрраўскага.*






2. Спарадзіўшы і ўзрасьціўшы, замуж аддала.
(Бадай наша Чачотачка здарова была):
Аўгіню — за Мірона,
А Аксіню — за Сапрона,
А Тацюху — за Дзяміда,
А Насьцюху — за Сьпірыда,
Радзівону — Макрыну,
А Хрытону — Грыпіну,
Хімку за Кузьму.

3. Як пачала Чачотачка пасаг выдаваць,
Як пачала невялічкіх усіх надараць:
Аўгіні — паясок,
А Аксіні — кажушок,
А Тацюсе — панчошачкі,
А Насьцюсе — суконачкі,
А Грыпіне — чаравічкі,
А Макрыне рукавічкі
Хімцы — істужкі.

4. Зазывала Чачотачка дзесяцёх мудрых,
Зазывала Чачотачка брацiткаў усіх:
Адзін быў Савацей,
Другі быў — Цімпялей,
Трэці быў — Атрахім,
А чацьвёрты Гарасім,
Быў Барыс і Дзяніс,
І дудар удалец,
Ды-й слуга Карпец.

5. Былі дзеўкі на вясельлі і малодзіцы,
Былі старэнькія бабкі і удовіцы:
Яся, Кася і Скрыпуся,
Была Хвядора з Габрусяй
І суседкі ўсе.

6. НанімалаЧачотачка скочну музыку,
Нанімала Чачотачка капэлю усю:
Верабейка на скрыпіцы,
Салавейка на прытыцы,
А сарокі у прыскокі,
А вароны у далоні,
Чорны галкі у цымбалкі,
Дробны пташкі на сьвісталкі,
Люба слухаць, як зайгралі
Музыку сваю.

7. А Чачотка ня гуляла — варыла
блыху;
Доўга госьці блыху елі, пакуль зьелі
Аж на трэцюю нядзелю [ўсю.
Госьці дамоў захацелі,
Дзякавалі за вясельле —
Ехалі дамоў.

(Другая частка 3-га штрофу ў некаторых мяйсцох сьпяваецца так:
Аўгіні — кажушок,
А Аксіні — хвартушок,
А Тацюсе — пялёнкі,
А Насьцюсе — суконкі,
А Грышіне — дзьве кошкі,
А Макрыне — панчошкі,
Хімцы — падвязкі.)

## 5. Ды ўжо сонейка.

*Павольна.* *Гарм. Тэрраўскага.*




Гдзе мяне мама будзе спатыкаць,
Чым мяне мама будзе частаваць?

Частуе мама мёдам ды віном.
— Якаво-ж табе за чужым сталом?

— Ці ела, мама, рэдзьку з палыном, —
Такаво-ж і мне за чужым сталом.

## 6. Вось у полі сосна.

*Павольна.* *Гарм. Тэрраўскага.*







Ды сустрэла мяне ды доля ліхая —
Любіў мяне барын, цяпер пакідае.

Садзіцца ў вазочак, едзе ў гарадочак,
А я маладзенька за ім у сьлядочак.

Доўга даганяла, але не дагнала,
На бітым гасьцінцы начаваці стала.

## 7. Як памёрла матулька.

*Павольна.* *Гарм. Тэрраўскага.*






Ужо сонца заходзіць,
Сірата ня прыходзіць . . .
Выйдзі, выйдзі, бацька, паглядзі
Сваяго ты дзіцяткі.

Ды стаяла каліна,
А пад ёю магіла,
Там сіротка хадзіла,
Сваю мамку будзіла:

Ой, устань, устань, мамка,
Цябе кліча дзіцятка.
Пашкадуй ты сіротку,
Умый мне ты галоўку.

## 8. Рабіна.

*Жвава.* *Гарм. Тэрраўскага.*

Д. і А.

Т.

Б.






2. Дзяўчына, дзяўчыначка,
Дзяўчыца мая,
Чаму-ж ты, дзяўчыначка,
Засмуцілася?

3. — Ой ня ў тую пораньку
На сьвет я прышла,
Маці, не падумаўшы,
Замуж аддала.

4. Ды у тую вёсачку,
Не ў вядомую,
У чужу сямеечку —
Не ў вясёлую.

5. Дальняя старонaчка
Бяз ветру сушыць,
Ня родны татулечка
Бяз віны журыць.

6. Вось жыву гадочак я,
Жыву і другі,
А на трэцім годзіку
Занудзілася.

7. К мамачцы у госьцікі
Захацелася,
Па родным татулечку
Затужылася.

## 9. А ў суботу сьвята будзе.

*Жвава.* *Гарм. Тэрраўскага.*







Пытаецца камар мухі:
— Дзе ты зімку зімавала?
Удалы камар . . . і г. д.

Дзе ты зімку зімавала,
Чым ты душу сьпітывала?
Удалы камар . . . і г. д.

— Зімавала я ў куточку,
Сьпітывалася мядочкам.
Удалы камар, раз тру-ля-ля!
Сьпітывалася мядочкам.



Б 58795

## 10. Зязюленька.




Ды не кажы, што ночанька мала.
Я малада ўсю ночаньку ня спала —
Міленькага з дарожанькі чакала.

Мой міленькі прыехаў так позна,
Параскідаў падушачкі розна.
О, ня кукуй, зязюленька, рана.

## 11. Усе казалі.




Б 58795



БССР Дзяржаўная бібліятэка імя Леніна

2. Расьці, расьці, васілёчак,
Вышэй таго быльнічка,
А як вырасьцеш высока,
Тады цябе апалю.

3. А як вырасьцеш высока,
Тады цябе апалю.
Апалоўшы васілёчка,
Тады замуж я пайду.

## 12. Ой, паехаў сын Даніла.

*Павольна.* *Гарм. Тэрраўскага.*







2. Гэй, пісала яго маці
Тры лісточкі да яго:
— Гэй, вярніся ты, Даніла,
Да-й да дому сваяго.

3. Ды ўжо твая Кацярына
Сваю волю паняла,
Коні твае вараныя
Пазаежджывала.

## 13. Ой, вяду бяду.

*Муж. хор. Паходна.* *Гарм. Тэрраўскага.*






2. Ой, ляж ты, бяда, ды засьні, бяда,
На ўсю ночаньку спаці,
А я малада, маладзюсенька
Пайду міла шукаці.

3. Ой, сядзіць мілы ды над вадою,
Падпёршыся рукою,
Лісты піша, цяжка сам дыша,
Не гаворыць са мною.

4. Каб з табою ды ты, мой міленькі,
Усё ліхое стала,
Як я малада, маладзюсенька
За табою прапала.

## 14. Сьвіньні ў рэпе.

*Хутка.* *Гарм. Тэрраўскага*



Стары сваю жонку хваліць,
Што хораша варыць;
А малады сваю зўдзіць:
Што зварыць — спаскудзіць.

Каб, здаецца, ды мнё зрацку
Гарэліцы шклянку
І тутуну мне на люльку
І красну Ганульку, —

Я-бы люлечку курыў-бы
І гарэлку піў-бы,
Красну дзеўку, Ганулечку,
Да сэрца туліў-бы.

## 15. А у садзе рэчанька.

*Павольна.* *Гарм. Тэраўскага.*




2. Адзін кажа — дзяўчына,
Другі кажа — рыбчына,
Трэці кажа — сэрца маё,
Ой ці пойдзеш за мяне?

3. —Нашто мяне пытаеш,
Калі хаты ня маеш?
— Я пасаджу ў чужую,
Пакуль сваю збудую.

4. Ды пастаўлю край сяла, —
Жыві, міла, весела!
— Тады была весела,
Як ад мамкі ехала.

## 16. А ў бары, бары.

*Паходна.* *Гарм. Тэраўскага.*




*Хор.*




2. Тудою ішлі
Тры салдацікі.
Гэй, гэй, гэй . . .

3. Што к матцы ідзе —
Песеньку пяе.
Гэй, гэй, гэй . . .

4. Што к татку ідзе,
Ў скрыпачку грае.
Гэй, гэй, гэй . . .

5. К мачысе ідзе —
Моцненька плача.
Гэй, гэй, гэй . . .

## 17. Дуда.

*Жвава.* *Гарм. Тэраўскага.*






Ладзілі славіць дудой Каляду.
Ду-ду-ду-ду, ду-ду-ду-ду,
Дудой Каляду.

Як разышліся музыкі гу-га!
Гу-га-гу-га . . .
Музыкі гуга!

Згінула гора, згінула туга.
Ту-га, ту-га . . .
Згінула туга.

Язэп старэнькі ёмкі ўзяўшы скрут,
Ту-ту-ту-ту . . .
Ёмкі ўзяўшы скрут,

Кіем на дзьверы паказаўшы тут:
Ту-ту-ту-ту . . .
Паказаўшы тут.

— Вы сабе дуйце сваё гоца-ца,
Гоца-ца-ца . . .
Сваё гоца-ца,

Толькі ня страшце Езуса Хлапца.
Ца-ца-ца-ца . . .
Езуса Хлапца.

## 18. Гэй, у лесе пры даліне.

*Паходна.* *Гарм. Тэраўскага.*






Пры даліне у гушчары
Калыхаліся камары,
Гэй, гэй . . . і г. д.

Дуб да дуба пахіліўся,
Камар з дуба зваліўся.
Гэй, гэй . . . і г. д.

Пабіў камар патыліцу
Аб дубову караніцу.
Гэй, гэй . . . і г. д.

Ой, пабіў камар бакі
Ды аб дубовыя сукі.
Да гэй, гэй . . . і г. д.

Ды пабіў камар калені
Аб дубовыя карэньні.
Гэй, гэй . . . і г. д.

Высыпаліся ўсе зубы
Ды з камарыкавай губы.
Гэй, гэй . . . і г. д.

Ляціць муха ратаваць,
Зімнай вадой адліваць.
Да гэй, гэй і г. д.

— Камарочку, родны браце,
Як-жа цябе ратаваці?
Гэй, гэй . . . і г. д.

— Пасылайце да аптэкі,
Ці ня будзе крыху лепі.
Гэй, гэй . . . і г. д.

У бальніцу завязіце
І мяне там палажыце.
Гэй, гэй . . . і г. д.

Там добрыя дахтары,
Вымуць душу без пары.
Да гэй, гэй . . . і г. д.

— Камарочку, родны браце,
Дзе-ж мне цябе пахаваці?
Гэй, гэй . . . і г. д.

— Не хавайце край дарогі,
Бо дратаваць будуць ногі.
Гэй, гэй . . . і г. д.

Не хавайце пры даліне,
Бо вырыюць мяне сьвіньні.
Гэй, гэй . . . і г. д.

Пахавайце ў цёмным лесе
Пры зялёненькім гарэсе.
Гэй, гэй . . . і г. д.

Будуць гарэхі шчыпаць,
Камарыка ўспамінаць,
Да гэй, гэй . . . і г. д.

— А ды чый-жа гэты помнік,
Ці маёр тут, ці палкоўнік?
Гэй, гэй . . . і г. д.

— Ні маёр тут, ні палкоўнік,
А сам камар супакойнік.
Гэй, гэй, ў лесе, ў лесе,
А сам камар супакойнік.

## 19. Што-й за месяц.

*Павольна.* *Гарм. Гацкага.*




2. Усе людзі, людзі кажуць,
Усе людзі гавораць:
Сорам, дзеўка, сорам, красна,
Позна звечара гуляць.

3. Дзяўчынанька кепска стала,
Стала плакаць, уздыхаць —
Хлапчынаньку шкада стала.
Стаў дзяўчыну сунімаць:

4. — Ня плач, дзеўка, ня плач, красна,
Прыду ў госьці да цябе,
Разгарыцца кроў гарача —
Вазьму замуж за сябе.

## 20. У нядзельку раненька.

*Адзін.* *Гарм. Тэрраўскага.*






Прышоў сынок пытае:
— Чаго, татачка, плачаш.
І на што-ж каму рана
Татка коніка корміш.

— Табе, сыночку, табе,
На вайну ты паедзеш,
На вайну ты паедзеш,
Ах, адтуль ня прыедзеш.

— Ня плач, татачка, пры мне,
Наплачашся без мяне,
Наплачашся даволі,
Як ня ўбачыш ніколі.

## 21. Поўна сонцу.

*Павольна.* *Гарм. Тэрраўскага.*






2. Пайшоў мілы на рыначак на таржок —
Я-й малада за ім сьледам у бяжок.

3. Міл таргуе, мне „дзень добры“ не дае, —
Знаць мой мілы насьмяхаецца з мяне.

## 22. Лапці.



2\. А у гэтай то вёсцы,
А у гэтай то роднай.
I. прып. Лапці ды лапці, лапці мае,
Лапці ды лапці, вы лыковыя.
Ні гу-гу, ні чы-чы, замаўчы
II. прып. Ды нічога не кажы,
Ды нічога не кажы.
Эх! Жыла там Палашка.

3\. А да гэнай да Палашкі,
А да гэнай да Палашкі.
I. прып. Лапці ды лапці . . .
II. прып. Ні гугу, ні чы-чы . . .
Эх! Хадзіў хлопец кудравасты.

4\. Ён прыносіў падарункі,
Ён прыносіў падарункі.
I. прып. Лапці ды лапці . . .
II. прып. Ні гу-гу, ні чы-чы . . .
Эх! Пірог ды баранкі.

*Насьля кожнага куплету хор съпявае „лапці“.*

## 23. Ах, вы, кумачкі мае.




Выхадзіце на вуліцу,
Гаварыце пасловіцу.

Гаварыце пасловіцу,
Чые мужы харошыя.

А вось мой старычышча,
Ня пускае на ігрышча,

Калі пусьціць на часочак —
Я гуляю вечарочак.

Прыду дамоў — дзела многа
І вадзіцы — ні расінкі.

Пайду млада за вадою,
Вазьму старога з сабою.

Вазьму старога з сабою
Ды ў палонку галавою.

## 24. Ой ты, палын.

*Жвава.* *Гарм. Тэррайскага.*







Ой як-жа мне, палыночку,
Ў чыстым полейку бываць,
Каля мяне касарыкі
Ўсё й з касочкамі стаяць.

## 25. Мне ня сьпіцца.

*Сумна, павольна* *Гарм. Тэррайскаго.*






2. Папрасіў-бы таварыша,
Няхай мяне завядзе,
А таварыш крашэй мяне —
Ён дзяўчыну адаб'е.

3. Маці сына ўсё пытае,
— Што, сынок, табе баліць?
Сынок матцы атвячае,
Што пара яму любіць.

## 26. Жыў на сьвеце Лявон.

*Адзін з хорам.* *Гарм. Тэрраўскага.*




*Хор сьпявае пасьля саліста апошнія словы куплетаў.*






2. Аж вось чуе Лявон
Са ўсіх клікі старон,
Што ён дурань—жыве па быдлячаму.
Ды-й сам тут зразумеў,
Што дум сьветлых ня меў,
Што падобен быў дрэву хадзячаму.

3. Ляжыць, дрэмле Лявон,
На грудзёх вырас клён.
Калі-ж вецер на сьвеце расходзіцца,
Шуміць шумна той клён,
Яшчэ ўстане Лявон...
Гэй, Лявоны у нас не пазводзяцца!

## 27. Рабіна.

*Гарм. Шымкуса.*




*(Словы гл. пад № 8.)*

## 28. Пісар гусі ганяе.

*Хутка, жвава.* *Муз. Тэраўскага.*






2. Няхай замуж ідзе,
Няхай мяне ня жджэ.

3. Дзеўка ў варот стаяла
І ўсе тое чувала.

4. Накапала карэньня
З пад сіняга камеўня,

5. Перамыла на рэчцы,
Заварыла ў малачцы.

6. Яшчэ корань ня ўскіпеў,
А ўжо пісар прыляцеў.

7. — А што-ж цябе прынясло,
Ці лапата, ці вясло?

8. Прынёс мяне сівы конь
Да дзяўчыны на ўспакой.

## 29. Каліна, маліна.

*Павольна.* *Гарм. Тэрраўскага.*






— Ветру не баюся, дажджу не жадаю,
А на маім мейсцы зялён явар расьце.

Зялён явар расьце, шырокія лісьці,
Дзяўчынка-сіротка, чаго смутна ходзіш?

Дзяўчынка-сіротка, чаго смутна ходзіш:
Ці галоўка баліць, ці сьвету ня воліць?

Галоўка не баліць і сьвету ня воліць,
А на гары-горцы цэркаўка стаяла.

А ў той цэркаўцы з нялюбым шлюб брала,
З нялюбым шлюб брала ды ў шлюба пытала:

— Ой, шлюбе, мой шлюбе, скажы ты мне праўду,
Ці горы капаці, ці з нялюбым шлюб браці?

## 30. На крутой гары.

*Гарм. Кашына.*






Чэша, чэша ён кудзёрачкі
Ды на галаве.

На чужыя-ж ды харошыя
Заглядаючы.

Ой, чужыя-ж ды харошыя,
Як ружовы цьвет.

## 31. Запрагу я пару коні.

*Паходна.* *Гарм. Тэрраўскага.*







На Ўкраіне хаты густы, што віхр направее,
Сама мэці лыжкі мые, бо дачка ня ўмее.

Мая дачка гультаечка — ня хоча рабіці,
Прычэшацца, прыбярэцца — ідзе хлопцаў любіці.

Адзін вядзе за ручанькі, другі за рукаў,
Трэці стаіць, ручкі ломіць, любіў ды ня ўзяў.

## 32. Ой, доля, мая доля.

*Хутка.* *Гарм. Тэрраўскага.*




2. Пайшла замуж за старога,
Захацела пагуляці.
Ой лі, ой люлі . . .

3. Захацела пагуляці,
Стары кажа: „сядзі ў хаце!"
Ой лі . . .

4. Ой доля, така доля,
З старым мужам жыць няволя.
Ой лі . . .

## 33. Ай, зялёна, зялёна.

*Павольна.* *Гарм. Кашына.*






Ой, вясёла, вясёла у мужа жана,
Таго яна і вясёла, што многа дабра.

Сьвеціць, сьвеціць месячык, ясная зара,
Асьвяціў дарожаньку, куды міл пайшоў.

Пайшоў, пайшоў міленькі із канца ў канец,
Зайшоў, зайшоў міленькі ды ў крайні дварэц.

## 34. У месяцы верасьні.

*Жвава.* *Муз. Тэрраўскага.*




2. І крывая, і сьляпая,
Яшчэ к таму і злая,
І крычыць, і вурчыць,
Проці дзеда не змаўчыць.

3. — Убярыся, бабка,
У новае бельля, —
Я-ж цябе павяду
З сабой на вясельле.

4. Убралася бабка
У новае бельля.
— Цяпер вядзі мяне, дзед,
З сабой на вясельле.

5. Узяў дзед бабку
За белую ручку, за крывую рожу
І сьпіхнуў дзед бабку
З моста у воду.

6. Цяпер, бабка, кайся,
Крыху пакупайся!
А што бабка узнырне,
То дзед кіем папхне.

7. Прышоў дзед да дому
І зачаў бажыцца:
— І ей-ей, і ей-богу,
Ня буду жаніцца!

8. Раздумаўся дзедка
І ў ладоні клешча:
— Калі буду жыў-здароў —
Ажанюся ешча!

## 35. Прыпеўкі

*Сярэдня.* *Гарм Тэрраўскага.*




2. Я на ганачку стаю,
Сьлёзы коцяцца —
Мяне замуж аддаюць —
Мне ня хочацца.

3. Адна баба ашалела,
Другая асьлепла.
Шалёная на сьляпой
Паехала ў пекла.

4. Ішоў Тодар з Тадораю,
Нашлі лапаць з аборою.
— Ой ты — Тодар, я — Тадора,
Табе лапаць, мне абора.

## 36. Ой, паехаў сын Даніла.

*Муз. Рагоўскага.*







*(Словы гл. пад № 12.)*

## 37. Дзе ты, хмелю, зімаваў.

*Гарм. Тэрраўскага.*

*Хутка.*






Зімаваў я у садку
Пад белай бярозай,
Начаваў я у таку
Пад луговым возам.

Маці сына ня пытай,
Што не разуваўся:
Ён дзяўчыну к сабе ждаў,
Але ашукаўся.

## 38. Скача верабей.

*Павольна.*

*Гарм. Тэрраўскага.*







ой, на - за - бы - лі мя - не, як на іх ня жаль мне. Чу - ю я
чу - ю я
ад лю - дзей, што ка мце баць - ка ў гось - ці бу - дзе.
што ка мне мат - ка
брат - ка
ся - стра
Ся-чы, ру - бай мос - ты, кла - дзі - це бя - ро-сты: бу - дзе ка мне бацька
мат - ка
брат - ка
ся-стра
ў гось-ці. А мой бацька е - дзе, е - дзе дый да до - му не за - е - дзе.
ма - я мат - ка
а мой братка
ма - я ся-стра е - дзе




## 39. За гарамі, за лясамі.

*Жвава* *Гарм. Рагоўскага.*







2. Дзеўка з бору ня выходзіць,
Краснага грыба знаходзіць,
Краснага грыба . . .
Гэй, гэй! Краснага грыба.

3. Яна яго падхапіла,
Ды у кошык палажыла,
Сама пайшла ў гай.
Гэй, гэй! Сама пайшла ў гай.

4. Гай зялёны завываець,
Дзеўка хлопца паджыдаець,
Хлопца — малайца.
Гэй, гэй! Хлопца — малайца.

## 40. У гародзе рэчка.

*Хутка, жвава.* *Гарм. Тэрраўскага.*







2. У гародзе мята,
За гародам мята,
Любіць, любіць мой міленькі,
Хоць я не багата.

3. Ой, бо дворка жонка,
Да работы лёгка,
Шнуруецца, ружуецца
І ліха ня знае.

4. Ой, пайду я жаць, жаць,
Дворка ляжа спаць, спаць,
Мой міленькі добра знае,
Каго спадабае.

## 41. Гэй, у садзе.

*Хутка.* *Гарм. Тэрраўскага.*






2. Скуль ня ўзяўся тут Іванька,
Дзявочы спадманка,
Ён вытаптаў чорну сьцежку
Дзеўцы пад ваконца.

3. Гэй, за рэчкай, за ракой
Музыканты йграюць,
Там-жа маю міленькую
Да шлюбу зьбіраюць.

## 42. Ці ня дудка мая.

*З збор. Славянскага.*

Д. і А.

Т.

Б.




*Адзін з хорам.*



Было ў бацькі тры сыны, да ух-я!
Усе трое Васілі. —
Адзін коні пасець,
Другі лапці пляцець,
Трэці сядзіць на каменьні,
Дзяржыць дуду на раменьні.
,,Ах ты дудка мая!
Весялуха мая!
Весяліла ты мяне
На чужой старане.
Як павесіў я дуду
На зялёным на дубу, —
Дуда з дубу звалілася,
На трэсачкі разьбілася.
Ці ня дудка-ж была,
Весялушка-ж мая,
Весяліла-ж мяне
На чужой старане.

## 43. Ой, Васілю, Васілю.

*Жвава.* *Гарм. Тэраўскага.*




2. Ой, Васілю, Васілю,
Вазьмі ты дзяціну.
А калі ня возьмеш, —
У пакосы кіну.

3. Васіль сена косіць,
Пракосы канчае.
Пракосы канчае,
,,Ката" прыпявае.

4. Як учула гэта
Васілёва маці,
— Васілю, Васілю,
Ідзі дамоў спаці.

## 44. Шуміць, гудзіць.

*Гарм. Тэрраўскага.*




## 45. Зялёны дубочак.

*Павольна.* *Гарм. Тэрраўскага.*






2. Ці валы прысталі, ці з дарогі зьбіўся,
Ці ў карчомцы п'яны з суседзьмі пабіўся?

3. Ні валы прысталі, ні з дарогі зьбіўся,
Малады малойчык бяз долі радзіўся.

4. Долі ёй ня мае, дзяўчыны ня знае —
Усей толькі долі, што чорныя бровы.

## 46. Каб я знала.

*Адзін.* *Муз. Рагоўскага.*




2. Нігды замуж-я-б павек не пайшла,
Я-ж у матанькі як жыла, так жыла-б.

3. Піла-б ела ўсё гатовае
І насіла-б ўсё бялёвае.

## 47. Тройцкая.

*Павольна..* *Муз. Тэрраўскага.*




2. Божа-ж мой, Божа-ж мой,
   Сьвякроўка мая шалёная,
   Божа-ж мой, і г. д.

3. Загадала мне работку рабіць
   Божа-ж мой . . .

4. Работку рабіць ды бялізну мыць.
   Божа-ж мой . . .

5. У суботку мачыць, у нядзельку
   сушыць.
   Божа-ж мой . . .

## 48. Ой, да тучыцца.

*Сярэдня.* *Гарм. Тэрраўскага.*









2. Ой, пайшоў дваранін плачучы,
А за ім ўсе дзяўчаты скачучы,
— Дваранін, дваранін, вярніся!
Вазьмі кубак вады, памыйся,

3. На коліку рушнік — утрыся,
У куфэрку грабень — прычашыся!
Дваранін, дваранін, адвяжыся!
К нам у поле на жніво не зьявіся!

## 49. З гары па даліне.

*Павольна.* *Гарм. Тэрраўскага.*






2. Я роскашы не зажыла, гора не забуду,
Толькі-ж свае млоды леты ўспамінаці буду.

3. Закладайце, запрагайце коні вараныя
Ды паедзем даганяці леты маладыя.

4. Як дагналі млоды леты на ліповым мосьце:
— Вярніцеся, млоды леты, хоць да мяне ў госьці!

5. — Ня вернемся, ня вернемся, бо ня маем чаго,
Трэба-ж было шанаваці здароўяйка свайго.

## 50. Стаіць у полі.

*Гар. Кашына.*







Кажуць людзі, што ня будзеш ты мая,
Гэй! чаму-ж, дзеўка, ды тагды не казала,

Як ад мяне ды падарачкі брала,
Гэй! ды сем парак чаравічак стаптала.

## 51. Ой, пад дубам.

*Жвава.* *Гарм. Тэраўскага.*




2. Як зьбяромся сёстры
У адно места,
Ды як загукаем
Мы жалосна.

3. Была ңаша мамка
Гаротная,
Яна нас маленькіх
Гадавала.

4. Яңа нашу долю
Праклінала,
А як-жа казала,
Так і стала.

## 52. Калыханка.

*Адзін з хорам.*
*Павольна.* *Гарм. Тэраўскага.*






2. На што, вецер, ты гудзіш,
Спаць Міхаську не даеш?
Сьпі, сыночку міленькі,
Ой да люлі, люленькі . . .

3. Успомніш матку ты сваю,
Як цябе люляла,
Як табе у ноч ня раз,
Песьню я сьпявала.

## 53. Гдзе радзілася (вясельная).

*Хутка.* *Гарм. Тэрраўскага.*




2. Пад калінкаю спаць лягла,
Калінку ножкаю кранула.

3. Калінку ножкаю кранула,
На мяне расіца сыпнула.

## 54. Ой, ляцелі гусі.

*Гарм. Шымкуса.*




*(Словы гл. пад № 66.)*

## 55. Паклаўшы надзеі (дуэт з „Пінскае шляхты“).

*Дуэт.* *Муз. Тэрраўскага.*




2. Так хоча няшчасная доля
Жыцьцё нам разьбіць — разлучыць,
Бог скажа — „мая гэта воля:
Ім трэба з сабою век жыць.“

3. Не памогуць ўсе злыя языкі,
Ні бацька, што нас старажыць . . .
На небе Бог — Пан наш вялікі,
Што хоча, то можа зрабіць.

## 56. А у садзе рэчанька.

*Адзін.* *Гарм. Тэррайскага*




*(Словы гл. пад № 15.)*

## 57. За Дунаем стаіць хатачка.

*Павольна.* *Гарм. Тэррайскага.*




2. Я ад маткі адлучылася
Ды к сьвякроўцы прылучылася.

3. А сьвякруха мне ня мамачка,
А сьвякруха мне ня родная.

4. А сьвякруха, мне ня родная,
Пасылала за Дунай па ваду.

5. За Дунаем стаіць хатачка
Ой, там жыве мая матачка,

6. Ой, там жыве мая родная.
Яна кліча на вячэру к сабе.

7. — Дзякуй, дзякуй, мая родная!
А я-ж з дому не галодная:

8. Я-й вячэрала з скарынкаю
Ды-й з чырвонаю калінкаю.

9. І з чырвонаю калінкаю
Ды-й з гарачаю сьлязінкаю.

## 58. Чалавек жонку б'е.

*Адзін. Сумна, павольна.* *З'збор. Славянскага.*



2. Чалавек жонку б'е, бічуе,
А ніхто-ж яе не ратуе.
— Сьвякроўка, матачка, роднень-
кая,
Пашкадуй ты мяне маладзеньку.
А свякровачка падбягае
Ды нагаечку падымае:
— Бі, сын, бі, дурную жонку бі,
Бі, цавучай, на свой звычай пера-
варачай.

3. Чалавек жонку б'е, бічуе,
А ніхто-ж яе не ратуе.
— Залоўка, сястрыца, роднень-
кая,
Пашкадуй ты мяне маладзеньку.
А заловачка падбягае,
Свайго братачку упрашае:
— Братка-ж мой, родненькі, паш-
кадуй,
На чужой старане цяжка будзе
мне.

## 59. Жніўная.

*Павольна.* *Гарм. Тэрраўскага.*




2. Звалілася сьвякроў з тыну,
Пабіла бакі свае яна і сьпіну.

3. Сьвякровачка праклінае, сьвякро-
вачка кляцець,
А чаго-ж ёй з тыну дадолу ляцець.

## 60. Белая ты, бярозачка.

*Сярэдня.* *Гарм. Тэрраўскага.*




2. Маладая малодачка,
Чаго-ж ты расплакалася?

3. — Як-жа мне ды ня плакаці,
Другі раз замуж ідучы.

4. Другі раз замуж ідучы,
На чужы парог ступаючы.

## 61. Ясная заранaчка (вясельная).

*Павольна.* *Гарм. Тэррайскага.*







2. Па залесейку ходзіць,
Па залесейку ходзіць,
Хмуркай апусьціўшыся,

3. Хмуркай апусьціўшыся,
Хмуркай апусьціўшыся,
Дожджыкам абліўшыся.

4. Маладая дзеванька,
Маладая дзеванька,
Па застолейку ходзіць.

5. Па застолейку ходзіць,
Па застолейку ходзіць
Коскамі апусьціўшыся.

6. Коскамі апусьціўшыся,
Коскамі апусьціўшыся
Сьлёзкамі абліўшыся.

## 62. Ой, да ты, калініца.

*Павольна.* *Гарм. Тэррайскага.*






2. Ой, да ты ня стой, ня стой,
Ой, да на гары крутой,
Ой, да ня спускай галья
На сіняе мора.

3. Ой, да ня спускай гальля
Ой, да на сіняе мора.
Ой, да на сінім моры
Карабель плыве.

4 Ой, да на сінім моры,
Ой, да карабель плыве,
Ой, да карабель плыве,
Мілага вязе.

## 63. Вецер ходзіць.

*Жвава.* *Гарм. Тэрраўскага.*









2. З Янкам ў харавод пайшла,
Хомку лепшага знайшла
Дагані мяне, пан Ясь,
Або пекценькі Міхась!
Ай люлі . . .

3. А ты, Хведар, сам ня свой,
Не ганяйся ты за мной!
Сьцяпан прыйдзе на часок,
Прыйдзе Янка галубок.
Ай люлі . . .

4. Вецер дунуў, і Аўдзей
Палюбіўся надта ей.
Дуне вецер яшчэ раз,
Так палюбіцца й Тарас.
Ай люлі . . .

## 64. Я сёньня тут.

*Павольна.* *Гарм. Тэрраўскага.*



Пахадзіла, пабрадзіла
Дзяўчынанька тут-жа,
Паўсхадзіла па сьлядочках
Зялёная рута.

У канцы грэблі стаяць вербы,
Што я пасадзіла.
Няма-ж майго міленькага,
Што верна любіла.

У канцы грэблі стаяць вербы,
Што я палівала.
Няма-ж майго міленькага,
Што верна кахала.

## 65. Цёмна ночка.

*Адна з хорам. Сумна.* *Муз. Тэрраўскага.*




2. Палажыла у каморы пад вакном
Ды й пакрыла тонкім белым палатном.

3. Прыехалі ды два брацяткі яго,
Пытаюцца яны братанькі свайго.

4. Вось вазьміце ды вы востранькі меч,
Ды зьніміце мне галованьку з плеч.

## 66. Прыляцелі гусі.

*Павольна.* *Гарм. Рагоўскага.*




2. Бадай тыя гусі
Да-й марна прапалі,
Як мы любіліся —
Цяпер перасталі.

3. Як мы любіліся,
Нас бяда ня знала,
Цяпер разыйшліся,
Як цёмная хмара.

4. Цёмна хмарка ідзе,
Дробны дожджык ідзе,
З нашага каханьня
Нічога ня будзе.

## 67. У печы палю.

*Хутка.* *Гарм. Тэрраўскага.*






На печ ўзьлезу гарох спару,
Ня лезь, Грышка, бо удару!
Бедна-ж і г. д.

Як удару не памалу,
Дык падкоцішся пад лаву.
Бедна-ж і г. д.

Ляжы, Грыша, ня рыдай
І з пад лавы выглядай.
Бедна-ж і г. д.

Каля кузенькі ішла,
Малаточачак знайшла.
Бедна-ж і г. д.

А мой Грыша кавалёчак,
Вазьмі сабе малаточак!
Бедна-ж і г. д.

## 68. Ты, дубочак.

*Сярэдня.* *Гарм. Тэрраўскага.*



2. Ты, дубочак зеляненькі,
Ціха лісьцем зашумі;
Гэй! ты, малойчык маладзенькі,
Сваім розумам трахні.

3. Ой, дубочак зеляненькі,
Да бярозачкі схілісь;
Гэй! ты, малойчык маладзенькі,
Да дзяўчынкі прытулісь.

4. Як бярозачка дубочак
Будзе моцна шанаваць,
Гэй! так цябе я, мой малойчык,
Буду ўвесь свой век кахаць.

## 69. Пад калінаю.

*Сярэдня.* *Гарм. Тэррайскага.*




2. Прыляцеў галубчык з сіняга мора,
Забіў галубка, галубка удова.

3. Сыплюць пшаніцу, ставяць вадзіцу:
— Еш, галубіца, бедна ўдавіца!

4. Яна ня ела, яна ня піла,
Па галубочку ўсё сьлёзы ліла.

5. Паляцеў галубчык за сіняе мора,
Прыгнаў галубцаў дваццаць чацьвёра.

6. Выбірай, галубка, каторага хочаш,
Каторага хочаш, каторага знаеш.

7. — Я-й выбірала, я ужо глядзела,
Няма такога, якога мела.

8. Мой быў міленькі чарнабрывенькі,
Твар бялюсенькі, сам маладзенькі.

## 70 Лявоніха.

*Жвава.* *Гарм. Тэрраўскага.*




Наехалі поўны дом наш казакоў
Ды забралі майго мужа у палон
Ды ня шкода, што яго ды забралі,
Толькі шкода, што ня моцна зьвязалі.

Ён паганец уцячэць ды уцячэць,
Мне галоўку маю бедну натаўчэць
Трэба будзе сьцерагчыся — уцякаць,
З вераб'ямі пад страхою начаваць.

*Другія словы.*

1. А Лявоніху Лявон палюбіў,
   Лявонісе чаравічкі купіў,
   Лявоніха-душа ласкавая
   Чаравічкамі палясківала.

2. А Лявоніха ня жонка была,
   Ня мытую мне кашульку дала,
   Ня мытую, не качаную,
   У суседа пазычаную.

3. Як я молада ў матулькі жыла,
   Як вішанька у садочку цьвіла;
   Цьвіла, цьвіла ды пацьвітывала,
   З малайцамі ды пагулівала.

4. Ой, згубіла мяне мамачка мая,
   Што за цябе мяне замуж аддала.
   Ой, чаму цябе пярун не забіў,
   Як ты мяне маладзеньку любіў.

## 71. А мой бацька добры быў.

*Жвава, весела.* *Гарм. Тэрраўскага,*



2. Ой глядзіце хлопцы ўсе,
Янку трасца як трасе!
Няхай трасе, няхай трасе,
Бо ён сьвіньні ўсё пасе.
Вось трасецца мой каток,
Як асінавы лісток,
А я з вамі малайцамі
Пагуляю хоць часок.

3. Ой спаліце пяруны
Майго Янку, бо дурны.
Назаляе толькі мне,
А каб сватацца — дык не.
Я кажу табе ня раз —
Прысылай сватоў да нас,
Татка добры — ён аддасьць,
У пасаг цялушку дасьць.

4. А той Янка, той благі
Ўсё сьмяецца — гі-гі-гі!
Да таго-ж часамі кпіць,
Ажна сэрца забаліць.
Ой, праліцеся дажджы,
А ты, Янчка, пажджы,
Учыню табе бяду —
За нікога не пайду.

## 72. Ой, на моры.

*Павольна.* *Гарм. Тэрраўскага.*




2. Там купаліся ды два брацяткі,
Ой, люлі, люлі, ды два брацяткі.

3. Вось прышоў да іх чужаземнічак,
Ой, люлі, люлі, чужаземнічак.

4. Вось адзін кажа: загубіць яго,
Ой, люлі, люлі, загубіць яго.

## 73. Маладая дзяўчынанька.

*Сумна.* *Гарм. Тэрраўскага.*







2. Як прышлося дзяўчынаньцы з малайцом вянчацца
Дык няма ў што для дзяўчыны ў той дзянёк прыбрацца.

3. Аддай, аддай мяне матка ды ў багату хатку,
Гдзе сьвякроўкі ганароўкі — наравіці буду.

4. Дзе залвіцы, як сястрыцы — пойдзем жыта жаці,
Дзе дзявораў тры, чатыры — люблю жартаваці.

## 74. Ці ўсе лугі пакошаны.

*Павольна.* *Гарм. Тэрраўскага.*









2. Ой, ці тую багатую, што хараша ходзіць,
Ой, ці тую ды бедненькую, што возьмець, то ўсе зробіць?

3. Ў нехарошай ды ў багатай — валы ды каровы,
А у беднай сіраціначчкі — толькі чорны бровы.

4. Ў нехарошай ды ў багатай валы паздыхаюць,
А у беднай сіраціначчкі бровы ня зьліняюць.

## 75. Ня ведала мая маці.

*Жвава.* *Гарм. Тэрраўскага.*






2. Ня ведала мая маці,
За каго замуж аддаць,
А аддала мяне маці
За разбойнічка.

3. Разбойнічак сувечара
Сабіраецца,
Разбойнічак супоўначы
Разьбіваецца.

4. Як найходзе ўжо дзень,
Тры кані з сабой вядзе.
Як на першым на капі
Сам разбойнічак.

## 76. Чарнаморац.

*Жвава.* *Гарм. Тэрраўскага.*






2. Чарнаморац з вайны едзе,
Ды сямёра каней вядзе,
Эх! а восьменькі вараненькі,
Ды як воран ён чарненькі.

3. Стаў ён коні напаяці,
Стала вада прыбываці,
Эх! стала вада прыбываці,
Чарноморац патапаці.

4. Чарнаморац патапае
Ды на мілую гукае:
— Эх! ратуй, ратуй, мая міла,
Калі верна ты любіла.

## 77. Ой, на двары дождж ідзе.

*Паходна.* *Гарм. Тэрраўскага.*




## 78. Ой, п'яна я, п'яна.

*Хутка.* *Гарм. Тэрраўскага.*






2. Мілы адчыняе,
У мілай пытае:
— Дзе-жа ты, міла, была,
Што аб дом забыла?

3. — На рыначку была,
Гарэлачку піла
Ї аб дом забыла.

4. Каб быў муж мой добры,
Ўзяў-бы канчук доўгі
Ды стаў-бы мілу біці —
Ня йдзі ў карчму піці!

## 79. Ой, у полі крынічанька.

*Сярэдня.* *Гарм. Тэрраўскага.*






2. Ой, пайду я дарогаю бягучы,
Ці ня ўгледжу п'янічанькі ідучы.

3. А мой горкі п'янічанька з карчмы йдзе,
На бок сваю галованьку ён нясе.

4. — Ой, што-ж ты, мая мілая, думала,
Як на гэту гібку кладку ступала.

5. — Я думала, мой міленькі, утануць,
Каб з табою, мой міленькі, мне ня жыць.

## 80. Сынок (запусная).

*Сярэдня.* *Гарм. Тэррайскага.*







2. — Ты, мамачка, ўстань, мой сон разгадай.
Мамачка ўстала, сон мой разгадала.

3. — Сыночак ты мой, што-й наймілейшы!
Ад'яжджай ты дамоў, што найскарэйша.

## 81. Гушкалка (сьпеў русалак).

*Гарм. Тэрраўскага.*






## 82. Ой, ты наш, ты Сымоне.

*Allegro.* *Муз. Рагоўскага.*






## 83. Завілася пчолка (карагодная).

*Жаночы хор.* *Муз. Тэрраўскага.*







2. Красңа сонца заіграла над людзьмі,
Гэй, люлі, . . .
3. Што-ж ты вясна, наша красңа, прынясла?
4. Прынясла — цёпла летца дзеля вас.
5. Малым дзеткам па яечку,
6. Старым бабкам па кіёчку,
7. Красным дзеўкам па вяночку,
8. Маладушкам па сярпочку.
9. Стары бабкі чапцы шыці,
10. Красны дзеўкі вянкі віці,
11. Маладушкі жыта жаці.
12. Красны дзеўкі на вулачку,
13. Маладушкі за люлечку.
14. Красны дзеўкі гулі да гулі,
15. Маладушкі люлі да люлі.

## 84. А у лесе (вясельная).

*Хутка.* *Гарм. Тэрраўскага.*




3. А яму дзяўчынка ды абед нясе.
   Вясна красна . . .

4. — Сядзьмо разам, хлопчык, паабедаймо.
   Вясна красна . . .

5. А я, па абедзе, скажу табе дзіва,
   Вясна красна . . .

6. Скажу табе дзіва найдзіўнейшае.
   Вясна красна . . .

## 85. Антон маладзенькі.

*Сярэдня.* *Гарм Тэрраўскага.*







2. Антон барадаты
Вёў казу каля хаты,
Антоніха паганяла,
На табаку зарабляла.

3. Антон казу вядзе,
Тпруць, муць, каза ня йдзе,
Антоніха пашіхае,
На кілішак зарабляе.

4. Антон маладзенькі,
Насованька караценька,
Аж трасецца, калоціцца —
Мёду яму йшчэ хочацца.

5. Яшчэ рэпку салодку,
Ды дзяўчыну красотку,
Кажа — рэпку саліць буду,
А дзяўчыну любіць буду.

## 86. Ці ня быстрая рэчка.

*Павольна.*
*Адзін.* *Гарм. Тэрраўскага.*



*Хор пасьля купл. заспевалы.*







3. Ты пойдзеш гарою,
А я даліною...
Я сама знаю, людзі гаво-
рaць,
Што ня быць за табою...

4. — Няхай гавораць
Усякае ліха,
А мы з табой, дзяўчы-
начка,
Любімося ціха.

2. — Ой біці — ня біла,
Сама засмуціла:
Ды ня даў мне Бог,
Ня судзіў мне Бог,
Каго шчыра любіла.

## 87. Пайшоў мілы.

*Павольна.* *Гарм. Тэррайскага.*






2. Было лета харошае,
Цяпер восень настае,
Траўка ў садзіку пасохла,
Салавейка не пяе.

3. Ўсе крынічанькі замерзьлі,
Ды і рэчка не цячэ.
Бяруць мілага ў жаўнеры —
Плакаць сілы не стае.

4. Я цяпер ўжо засталася —
Ні дзяўчынка, ні ўдава,
Сірацінкай-адзіночкай,
Ракрутачка малада.

5. І ніхто ўжо не палюбіць, —
Ні хлапец, ды ні ўдавец;
Прыласкаець, прыгалубіць
Толькі жаўнер маладзец.

## 88. Маці мая старая.

*Павольна.* *Гарм. Тэрраўскага.*







2. Нашто мяне скарала,
За п'яніцу аддала?
Гэй . . .

3. А п'яніца ў карчме п'е,
Прыдзе дамоў – мяне б'е.
Гэй . . .

4. Ляжыць мілы на палу,
Зьвязаў шоўкам галаву.
Гэй . . .

## 89. Каб я знала.

*Сумна.* *Муз. Тэрраўскага.*




*(Словы гл. пад № 46.)*

## 90. А на гары цэркаўка (купальская).

*Сумна, павольна.* *Гарм. Тэрраўскага.*






На цэркаўцы крыжычык,
На крыжычку макаўка,
На макаўцы ластаўка.
Сядзіць яна высока,
Глядзіць яна далёка.

## 91. Ды ў гордае цешчы (вясельная).

*Жвава.* *Гарм. Тэрраўскага.*







3. Ды на зяця ды мяцель мяце,
Ды на зяця дробны дожджык ідзе.

4. Ды на зяця дробны дожджык ідзе,
— Скрыйся, зяцю, скрыйся.

5. Скрыйся, зяцю, скрыйся.
Ды кулямі прыкрыйся.

2. Стаў зяць за варотамі
Ды на зяця ды мяцель мяце.

## 92. А у лесе грыбы зарадзілі.

*Жвава.* *Гарм. Тэрраўскага.*




Адна дзеўка ў лесе заблудзіла,
Маладая ў гаю заблудзіла.

Прыблудзіла к зялёнаму дубу.
— Ой, тут-жа я начаваці буду.

Я-ж думала, што дуб зеляненькі,
Ажна стаіць казак маладзенькі.

## 93. Сьпеў маладой.

*Павольна, сумна.* *Гарм. Тэрраўскага.*






2. Век свой сумавала,
Век свой сумавала,
Дружка паджыдала.

3. Прышоў Ясь міленькі,
Прышоў Ясь міленькі,
Закрыў сьвет мне бяленькі.

4. Мамка хмура ходзіць,
Мамка хмура ходзіць —
З Яся вачэй ня зводзіць.

5. Будзе, Ясь, мне ліха,
Будзе, Ясь, мне ліха,
Маё сэрца заціхла.

## 94. Першы дзень.

*Жвава.* *Гарм. Тэраўскага.*







чаць-вяр-ток, ве-ся-лу-ха бы-ла пят-ніч-ка,
га-ра-жан-ка бы-ла дзяў-чын-ка, у панскай ха-це бы-ла
p
ўзрош-ча-на, пі-ра-га-мі бы-ла ўзвош-ча-на ў вёс-ку за-муж




## 95. Да свата (вясельная).

*Жвава, адрывіста.* *Гарм. Тэраўскага.*




Ды казалі — сват наш вельмі харош.
Ажно ў свата доўгі буслаў нос.
А ў свата лыса галава
Ды казьліна рыжа барада.
Мы пасыпем свату канапель:
— Клюй, наш сватка, як верабей!

Скача сват вясельле, як белка,
Хоча маладзіцца, як дзеўка.
Плавае па хаце, як таран,
Лыпае вачыма, як баран.
— Барадою, сватка, патрасі,
Маладзіцам чаркі паднясі.

Калі-ж, сват, гарэлкі не дасі,
Караваю трасцу ты зьясі.

## 96. Ой, хадзіў-жа ўсё малойчыку.

*Паходна.*







2. Надаела, надакучыла
Завіваючы,
На чужыя, на харошыя
Пазіраючы.

3. Бо чужыя ўсе харошыя,
Як ружовы цьвет,
А мне шэльма ды няўдалечка
Завязала сьвет.

## 97. У гародзе рута, мята.

*Сярэдня.* *Гарм. Тэрраўскага.*






Часалася, ўмывалася,
  На рынак пайшла.
Як сустрэлі дзяўчынаньку
  Ды трох малайцоў.

Адзін вядзе за ручаньку,
  Другі за рукаў,
Трэці стаіць, сэрца баліць:
  Любіў ды ня ўзяў . . .

Карміў, паіў дзяўчынаньку,
  Чаяў за сябе,
Засталася дзяўчынанька
  Людзям ды ня мне.

Добра-ж было дзяўчынаньцы
  Гарэлачку піць,
А цяпер-жа адказуеш:
  Не магу любіць.

Шкада, шкада маіх ручак,
  Што я абымаў;
Шкада, шкада маіх губак,
  Што я цалаваў.

Шкада, шкада майго сэрца,
  Што я так любіў;
Шкада, шкада маіх ножак,
  Што я к ёй хадзіў.

## 98. Ды ляцяць міскі.

*Адна з хорам.* *Гарм. Тэрраўкага.*







*Канец хутка й моцна.*

*УВАГА. Пасьля кожнага куплету хор сьпявае „Ой люлі“, а саліст маўчыць.*

2. Сама села, падпёрлася,
Заплакала, уцёрлася.

3. Людзі кажуць — што ёй стала,
Чаму-ж замуж не папала?

4. Дзеўка замуж не папала,
Бо чыноўніцаю стала.

5. Як чыноўніцаю стала,
Ахвіцэра пакахала.

6. Ахвіцэра пакахала,
У жыцьці бяды ня знала.

7. Ой, ня доўга так жылося —
Жыць на кухні давялося.

8. Біць талеркі, міскі стала,
Бо напрасна пакахала.

## 99. Беларуская марсэльеза.

*Гарм. Тэрраўскага.*



2. Што гэта за марная доля няшчасная:
Бяз хлеба, бяз грошаў працуй . . .
Усюды ганяюць, усюды сьмяюцца,
Ну, проста, хоць крыкні „ратуй!"

3. Сьмяюцца над намі багатыя людзі,
Здаецца панамі іх зваць.
Мы доўга цярпелі, цярпець больш ня можам —
Дык пойдзем мы долі шукаць!

4. Мы дружна паўстанем з касамі, з сярпамі
Прагонім з зямлі палачоў!
Няхай нас сустрэнуць палямі, лугамі
Грамады працоўных людзёў!

ЗЬМЕСТ.


Стр.

АД АЎТАРА . . . . . 5
1. Міжнародны гімн . . . . . 7
2. А хто там ідзе . . . . . 9
3. Панам мы песьні не сьпяваем . . . . . 11
4. Чачотачка . . . . . 13
5. Ды ўжо сонейка . . . . . 15
6. Вось у полі сосна . . . . . 16
7. Як памёрла матулька . . . . . 16
8. Рабіна . . . . . 17
9. А ў суботу сьвята . . . . . 18
10. Зязюленька . . . . . 19
11. Усе казалі . . . . . 19
12. Ой, паехаў сын Даніла . . . . . 20
13. Ой, вяду бяду . . . . . 20
14. Сьвіньні ў рэпе . . . . . 21
15. А у садзе рэчанька . . . . . 22
16. А ў бары, бары . . . . . 23
17. Дуда . . . . . 23
18. Гэй, у лесе пры даліне . . . . . 24
19. Што-й за месяц . . . . . 26
20. У нядзельку раненька . . . . . 26
21. Поўна сонцу . . . . . 27
22. Лапці . . . . . 28
23. Ах, вы, кумачкі мае . . . . . 29
24. Ой ты, палын . . . . . 30
25. Мне ня сьпіцца . . . . . 30
26. Жыў на сьвеце Лявон . . . . . 31
27. Рабіна . . . . . 32
28. Пісар гусі ганяе . . . . . 33
29. Каліна, маліна . . . . . 34
30. На крутой гары . . . . . 35
31. Запрагу я пару коні . . . . . 36
32. Ой, доля, мая доля . . . . . 37
33. Ай, зялёна, зялёна . . . . . 37
34. У месяцы верасьні . . . . . 38
35. Прыпеўкі . . . . . 39
36. Ой, паехаў сын Даніла . . . . . 40
37. Дзе ты, хмелю, зімаваў . . . . . 40
38. Скача верабей . . . . . 41
39. За гарамі, за лясамі . . . . . 43
40. У гародзе рэчка . . . . . 44
41. Гэй, у садзе . . . . . 44
42. Ці ня дудка мая . . . . . 45
43. Ой, Васілю, Васілю . . . . . 46
44. Шуміць, гудзіць . . . . . 47

Стр.


45. Зялёны дубочак . . . . . . . . . 47
46. Каб я знала . . . . . . . . . 48
47. Тройцкая . . . . . . . . . 49
48. Ой, да тучыцца . . . . . . . . . 49
49. З гары па даліне . . . . . . . . . 50
50. Стаіць у полі . . . . . . . . . 51
51. Ой, пад дубам . . . . . . . . . 52
52. Калыханка . . . . . . . . . 52
53. Гдзе радзілася . . . . . . . . . 53
54. Ой, ляцелі гусі . . . . . . . . . 54
55. Паклаўшы надзеі . . . . . . . . . 54
56. А у садзе рэчанька . . . . . . . . . 55
57. За Дунаем стаіць хатачка . . . . . . . . . 55
58. Чалавек жонку б'е . . . . . . . . . 56
59. Жніўная . . . . . . . . . 57
60. Белая ты, бярозачка . . . . . . . . . 57
61. Ясная заранaчка . . . . . . . . . 58
62. Ой, да ты, калініца . . . . . . . . . 58
63. Вецер ходзіць . . . . . . . . . 59
64. Я сёньня тут . . . . . . . . . 60
65. Цёмна ночка . . . . . . . . . 61
66. Прыляцелі гусі . . . . . . . . . 62
67. У печы палю . . . . . . . . . 62
68. Ты, дубочак . . . . . . . . . 63
69. Пад калінаю . . . . . . . . . 64
70. Лявоніха . . . . . . . . . 65
71. А мой бацька добры быў . . . . . . . . . 66
72. Ой, на моры . . . . . . . . . 67
73. Маладая дзяўчынанька . . . . . . . . . 68
74. Ці ўсе лугі пакошаны . . . . . . . . . 68
75. Ня ведаля мая маці . . . . . . . . . 69
76. Чарнаморац . . . . . . . . . 70
77. Ой, на двары дождж ідзе . . . . . . . . . 71
78. Ой, п'яна я, п'яна я . . . . . . . . . 71
79. Ой, у полі крынічанька . . . . . . . . . 72
80. Сынок . . . . . . . . . 73
81. Гушкалка . . . . . . . . . 74
82. Ой, ты наш, ты Сымоне . . . . . . . . . 75
83. Завілася пчолка . . . . . . . . . 76
84. А у лесе . . . . . . . . . 77
85. Антоң маладзенькі . . . . . . . . . 78
86. Ці ня быстрая рэчка . . . . . . . . . 78
87. Пайшоў мілы . . . . . . . . . 79
88. Маці мая старая . . . . . . . . . 80
89. Каб я знала . . . . . . . . . 81
90. А на гары цэркаўка . . . . . . . . . 81
91. Ды ў гордае цешчы . . . . . . . . . 82
92. А у лесе грыбы зарадзілі . . . . . . . . . 83
93. Сьпеў маладой . . . . . . . . . 83
94. Першы дзень . . . . . . . . . 84
95. Да свата . . . . . . . . . 86
96. Ой, хадзіў-жа ўсё малойчыку . . . . . . . . . 87
97. У гародзе рута, мята . . . . . . . . . 87
98. Ды ляцяць міскі . . . . . . . . . 88
99. Беларуская Марсельеза . . . . . . . . . 89

# ЗЬМЕСТ.

Стр.

АД АЎТАРА . . . . . . . . 5
1. Міжнародны гімн . . . . . . . . 7
2. А хто там ідзе . . . . . . . . 9
3. Панам мы песьні не сьпяваем . . . . . . . . 11
4. Чачотачка . . . . . . . . 13
5. Ды ўжо соцейка . . . . . . . . 15
6. Вось у полі сосна . . . . . . . . 16
7. Як памёрла матулька . . . . . . . . 16
8. Рабіна . . . . . . . . 17
9. А ў суботу сьвята . . . . . . . . 18
10. Зязюленька . . . . . . . . 19
11. Усе казалі . . . . . . . . 19
12. Ой, паехаў сын Даніла . . . . . . . . 20
13. Ой, вяду бяду . . . . . . . . 20
14. Сьвіньні ў рэпе . . . . . . . . 21
15. А у садзе рэчанька . . . . . . . . 22
16. А ў бары, бары . . . . . . . . 23
17. Дуда . . . . . . . . 23
18. Гэй, у лесе пры даліне . . . . . . . . 24
19. Што-й за месяц . . . . . . . . 26
20. У нядзельку раненька . . . . . . . . 26
21. Поўна сонцу . . . . . . . . 27
22. Лапці . . . . . . . . 28
23. Ах, вы, кумачкі мае . . . . . . . . 29
24. Ой ты, палын . . . . . . . . 30
25. Мне ня сьпіцца . . . . . . . . 30
26. Жыў на сьвеце Лявон . . . . . . . . 31
27. Рабіна . . . . . . . . 32
28. Пісар гусі ганяе . . . . . . . . 33
29. Каліна, маліна . . . . . . . . 34
30. На крутой гары . . . . . . . . 35
31. Запрагу я пару коні . . . . . . . . 36
32. Ой, доля, мая доля . . . . . . . . 37
33. Ай, зялёна, зялёна . . . . . . . . 37
34. У месяцы верасьні . . . . . . . . 38
35. Прыпеўкі . . . . . . . . 39
36. Ой, паехаў сын Даніла . . . . . . . . 40
37. Дзе ты, хмелю, зімаваў . . . . . . . . 40
38. Скача верабей . . . . . . . . 41
39. За гарамі, за лясамі . . . . . . . . 43
40. У гародзе рэчка . . . . . . . . 44
41. Гэй, у садзе . . . . . . . . 44
42. Ці ня дудка мая . . . . . . . . 45
43. Ой, Васілю, Васілю . . . . . . . . 46
44. Шуміць, гудзіць . . . . . . . . 47

Стр.

45. Зялёны дубочак . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 47
46. Каб я знала . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 48
47. Тройцкая . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 49
48. Ой, да тучыцца . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 49
49. З гары па даліне . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 50
50. Стаіць у полі . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 51
51. Ой, пад дубам . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 52
52. Калыханка . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 52
53. Гдзе радзілася . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 53
54. Ой, ляцелі гусі . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 54
55. Паклаўшы надзеі . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 54
56. А у садзе рэчанька . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 55
57. За Дунаем стаіць хатачка . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 55
58. Чалавек жонку б'е . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 56
59. Жніўная . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 57
60. Белая ты, бярозачка . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 57
61. Ясная заранача . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 58
62. Ой, да ты, калініца . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 58
63. Вецер ходзіць . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 59
64. Я сёньня тут . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 60
65. Цёмна ночка . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 61
66. Прыляцелі гусі . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 62
67. У печы палю . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 62
68. Ты, дубочак . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 63
69. Пад калінаю . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 64
70. Лявоніха . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 65
71. А мой бацька добры быў . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 66
72. Ой, на моры . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 67
73. Маладая дзяўчынанька . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 68
74. Ці ўсе лугі пакошаны . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 68
75. Ня ведаля мая маці . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 69
76. Чарнаморац . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 70
77. Ой, на двары дождж ідзе . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 71
78. Ой, п'яна я, п'яна я . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 71
79. Ой, у полі крынічанька . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 72
80. Сынок . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 73
81. Гушкалка . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 74
82. Ой, ты наш, ты Сымоне . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 75
83. Завілася пчолка . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 76
84. А у лесе . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 77
85. Антон маладзенькі . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 78
86. Ці ня быстрая рэчка . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 78
87. Пайшоў мілы . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 79
88. Маці мая старая . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 80
89. Каб я знала . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 81
90. А на гары цэркаўка . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 8[illegible]
91. Ды ў гордае цешчы . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 8[illegible]
92. А у лесе грыбы зарадзілі . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 8[illegible]
93. Сьпеў маладой . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 8[illegible]
94. Першы дзень . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 8[illegible]
95. Да свата . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 8[illegible]
96. Ой, хадзіў-жа ўсё малойчыку . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 8[illegible]
97. У гародзе рута, мята . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 8[illegible]
98. Ды ляцяць міскі . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 88
99. Беларуская Марсельеза . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 89

# ПАПРАЎКІ І ДРУКАРСКІЯ АБМЫЛКІ.

| Стр. | Радкі тэксту | Надрукавана | Павінна быць |
|---|---|---|---|
| 3 | 3 зьнізу | Навукова-Літерац-кага | Навукова-Літэ-рацкага |
| 5 | 11 зьверху | здразумець | зразумець |
| 5 | 4 зьнізу | Пуроускаму К. | Пуроўскаму К., |
| 9 | 7 ,, | посьля | пасьля |
| 15 | 2 ,, | рэдьзку | рэдзьку |
| 28 | 6 зьверху | лапцёука | лапцёўка |
| 33 | 3 ,, | хлопцау | хлопцаў |
| 57 | 13 ,, | Терраўскага | Тэрраўскага |
| 71 | 8 зьнізу | п'аня | п'яна |
| 83 | 4 ,, | Ажна | Ажно |
| 90 | 4 зьверху | можам | будзем |

Nr. 3
152

B000000 14 13478